# MEMORIA ET GLORIA

## ПРА СВЕТЛАГА ЧАЛАВЕКА – АЛЯКСАНДРА МІКАЛАЕВІЧА МІХАЛЬЧАНКУ

Час не спыніць, не вярнуць назад. Ён не падуладны ні фізічнаму ўздзеянню, ні эмоцыям чалавечым. А так калі-нікалі хацелася б з ім саўладаць, зрабіць паслухмяным, перагарнуць старонкі пражытага. Нельга па сутнасці фізічных законаў. Але ёсць у кожнага з нас магчымасць гэта зрабіць праз сваю памяць. Толькі яна дазваляе зноў вярнуць былое, неаднаразова «ўвайсці ў адну і тую ж раку», зноў сустрэцца з паплечнікамі па тых справах, у якія ты не толькі ўнёс часціну самога сябе, але якія, па сутнасці, цябе фарміравалі.

На жаль, часцей за ўсё мы звяртаемся да сваёй памяці якраз тады, калі хтосьці з нашых блізкіх і знаёмых пакідае гэты свет. Неяк нам не ўцяміць, што пра чалавека, які нам дарагі і знакавы для цябе, а тым больш для справы, якую мы сумесна робім, неабходна распавядаць не кулуарна, а публічна, гучна, каб усе ведалі, што за асоба жыве і так прадуктыўна дзейнічае сярод нас.

Смерць Аляксандра Мікалаевіча Міхальчанкі для мяне стала абсалютнай недарэчнасцю, несправядлівасцю. Ён амаль што 20 гадоў майго жыцця быў натуральным і нават звыклым у тым дастаткова не шырокім коле асабістага атачэння, якое кожнага з нас суправаджае па жыцці. Нельга сказаць, што Аляксандр Мікалаевіч быў мне сябрам ці мы рэгулярна выходзілі на тэлефонныя і іншыя камунікацыйныя сувязі. Не, мы сустракаліся ў апошнія гадоў дзесяць ці то на вуліцы выпадкова, ці то ў калідорах гістфака БДУ (як гэта і адбылося ў апошні раз, калі Міхальчанка завітаў на факультэт, як цяпер можна ўсведамляць, каб развітацца з той своеасаблівай аўрай, да стварэння якой ён меў непасрэднае дачыненне).

Найбольш цеснымі нашы кантакты былі на працягу 1990-х гг. На іх пачатку і адбылося маё знаёмства з Аляксандрам Мікалаевічам, як ён і быў афіцыйна прадстаўлены ў кабінеце дэкана гістарычнага факультэта БДУ П. А. Шупляка. Для мяне, тады яшчэ маладога кіраўніка ўніверсітэцкага «сярэдняга звяна», кіраўнік дзяржустановы падаўся асобай надзвычай важнай, аўтарытэтнай ужо адной сваёй гучнай пасадай. Што тут рабіць, калі вясковае паходжанне і савецкі менталітэт не дазвалялі ўспрымаць чалавека асобай праз яго перш за ўсё інтэлектуальныя праявы, уменне заставацца чалавекам сярод людзей, а не «наменклатурным аўтарытэтам». І вось якраз Аляксандр Мікалаевіч, які, дарэчы, «соб-

ственной персонай» (што для мяне тады здавалася дзіўным) завітаў на факультэт, падаў прыклад таго, у чым розніца паміж чыноўнікам-інтэлектуалам і проста чыноўнікам. Мы сабраліся абмеркаваць важныя, але і цяжкія для вырашэння, пілотныя праекты пабудовы сістэмы падрыхтоўкі архівістаў з вышэйшай адукацыяй для суверэннай Беларусі. Эйфарыя і ўзнёслы настрой таго шчаслівага для беларусаў часу абцяжарваліся многімі абставінамі: амаль што ўсё ў нашай сістэме вышэйшай гістарычнай адукацыі патрэбна было карэнным чынам перайначваць, рабіць і «сваім», і сучасным, і дзейсным. І рабіць «з ліста», калі ні вопыту, ні неабходных сродкаў не было, як і адпаведнай якаснасці «адміністрацыйнага рэсурсу», многае трэба было выцягваць праз сілу з кабінетаў чыноўнікаў рознага рангу і паўнамоцтваў.

І вось да нас, універсітэцкіх гісторыкаў, якія задумалі-такі стварыць на факультэце асобную адукацыйную плынь па падрыхтоўцы для Беларусі сваіх архівістаў, завітаў сам старшыня Дзяржаўнага камітэта па архівах і справаводстве Рэспублікі Беларусь! Прыём быў зроблены адпаведны: афіцыйныя перамовы, глыбокае пранікненне ў сутнасныя абставіны і праблемы будучага вучэбнага плана для новага архівазнаўчага аддзялення, абмеркаванне фінансавага і бюракратычна-папяровага суправаджэння новай справы і безліч іншага. На мяне, яшчэ маладога намесніка дэкана, на мае плечы звалілася гэтае пісьмова-афармiцельскае дзейства, якое было як прысуд да пакарання праз адлучэнне ад навуковых штудый, ад спартыўных захапленняў, нават ад сям'і! Але тое, што агучвалі два такіх высокіх начальнікі, падавалася як прарыў фронту. Усё важна, усё ўпершыню, з нуля. Тады я і зразумеў сваё дачыненне да той вялікай справы, якую рабілі мае старэйшыя калегі-таварышы. І ўвайшоў у тое кола аднадумцаў, якое ў поўнай меры ўвасабляў Аляксандр Мікалаевіч. Чым не перастану ганарыцца ўсё сваё жыццё.

Першае напружанне зменшылася пасля таго, як пачуў ад Аляксандра Мікалаевіча расказ пра свае студэнцкія гады (як іх не згадаць, калі ўсе думкі-меркаванні круціліся вакол студэнцтва). Аказалася, што ён скончыў наш БДУ! І зусім атмасфера сустрэчы стала лёгкай і сяброўскай пасля адкрыцця другой яе часткі. Тады не было аніякіх пытанняў наконт правядзення ў сценах факультэта «нефармальных» мерапрыемстваў. Яны наладжваліся за сродкі дэкана і яго намесніка дастаткова часта, бо патрэбна было прыняць высокіх замежных гасцей (іх ездзіла да нас вельмі шмат), паслоў вялікіх і малых краін, функцыянераў ад сістэмы еўрапейскай адукацыі, сваіх калег, якія лічылі за гонар удзельнічаць у мностве навуковых канферэнцый (у тым ліку дзвюх Усебеларускіх!), што ладзіліся на факультэце. Таму Аляксандр Мікалаевіч адразу быў запрошаны з кабінета дэкана ў кабінет намесніка, дзе ўжо ўсё было падрыхтавана.

Тады і адбылося спазнанне гісторыка, дасканалага знаўцы сваёй справы, арыгінальнага суразмоўцы, інтэлектуала. Гэты светлы чалавек адразу стаў сваім, як ні дзіўна, блізкім і зразумелым у многіх дачыненнях калегам. Потым былі многія «перасячэнні» нашых дарог. Нягледзячы на вядомую суб'ектыўнасць маіх рад-

коў, яны прадстаўляюць Аляксандра Мікалаевіча як пазітыўную асобу. Ён успрымаўся амаль што ўсімі «сваім» чалавекам, шчырым у адносінах, высакародным у ацэнцы чужых пралікаў, адказным у дзеяннях прафесіяналам высокага гарту.

Напрыканцы згадаю два эпізоды з маіх «перасячэнняў» з Аляксандрам Мікалаевічам. Так, у хуткім часе пасля першай нашай сустрэчы ў тыя гады, калі і прафесар, і студэнт гістфака не толькі працавалі і вучыліся, але і выжывалі, да будынка факультэта падруліў грузавік, даверху напакаваны нейкімі велізарнымі фірмовымі клункамі (аб гэтым сведчылі замежныя «лэйбы»). За грузавіком адразу ж пад'ехала «Волга», з якой выйшаў радасны Міхальчанка і смеючыся паказаў рукой убок, гаворачы: «Гэта вашым выкладчыкам і студэнтам на ўсталяванне хатняга і факультэцкага побыту!» Аказалася, што Аляксандр Мікалаевіч па-свойму ўспрыняў нашу размову ў «нефармальнай» абстаноўцы. Ён, карыстаючыся тагачаснымі магчымасцямі размяркоўваць так званую «гуманітарную дапамогу», якую дасылалі беларусам з-за мяжы (такое таксама было), накіраваў на факультэт і цюкі з адзеннем (сэканд-хэнд), і вялікія мяхі з сухім малаком і інш. Колькі месяцаў прафсаюз размяркоўваў гэтае багацце паміж маладымі студэнцкімі сем'ямі (тады на кожным курсе было па дзесятку «гістарычных сем'яў»!), паміж апантанымі да навукі, але не занадта заможнымі выкладчыкамі факультэта.

І яшчэ, больш асабістае. Я, гісторык Яноўскі, як і многія калегі савецкага гарту выхавання, лічыў сябе гісторыкам, бо быццам бы ведаў гісторыю Расіі, эпахальнасць і ўнікальнасць яе дзяржаўнасці. А на гісторыю свайго роду, на лёсы маіх продкаў па бацькоўскай і мацярынскай лініях амаль не звяртаў увагі, не лічыў неабходным дазнацца, адкуль сам пайшоў, што нясу ў сабе ад сваіх прашчураў. Аляксандр Мікалаевіч хутка «працёр лінзы акуляраў» ужо даўно як бы адбыўшагася гісторыка, падштурхнуў да гэтай тэмы. Больш таго, менавіта пры дапамозе Аляксандра Мікалаевіча ў маіх руках з'явіліся копіі архіўных дакументаў, якія распавядалі аб тым, як у канцы XVIII — пачатку XIX ст. дамагаліся дваранскага статуса ад расійскіх імперскіх улад браты Яноўскія з-пад Міншчыны, прадстаўляючы свае дакументы аб шляхецтве і казыраючы фамільным гербам «Яніна». Дзякуючы гэтаму шчыраму і адказнаму чалавеку я амаль што дэталёва спазнаў гаротны лёс майго роднага дзеда Ульяна, непісьменнага калгаснага каваля, які загінуў падчас рэпрэсій 1930-х гг.

Светлы-светлы чалавек, Аляксандр Мікалаевіч! Светлая табе памяць!

*А. А. Яноўскі*